***А. Я. Камінскі,***
*дацэнт, Беларускі дзяржаўны*
*ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

# ПАЛОМНІЦТВА ЯК РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВАЯ ЧАСТКА СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Падарожжа вернікаў да святых месцаў з надзеяй атрымаць звышнатуральную дапамогу ўзнікла ў старажытнай рэлігійнай практыцы розных народаў. На мяжы XX–XXI стст. рэлігійнае і свецкае паломніцтвы набылі сусветны маштаб як самастойны элемент святочнай культуры і гістарычна склаўшаяся форма складаных сімвалічных паводзін, якія выяўляюць пэўныя сацыяльныя і культурныя ўзаемаадносіны, каштоўнасці. Сутнасцю гэтага феномена ў змястоўным і фармальным аспектах з'яўляецца наяўнасць сакральнага пачатку, звязанага з Абсалютам – творчай першаасновай усяго існага, дасканаласцю быцця. Для паломнікаў такім аб'ектам пакланення з'яўляецца выбраная імі святыня – храмы, манастыры, цудатворныя іконы, святыя мошчы, крыніцы, рэліквіі.

Разглядаючы рытуальную канцэпцыю сакральнага падарожжа, відавочнай становіцца яго рэгламентаваная і рэгулюемая паслядоўнасць дзеянняў у сінкрэтычна-відовішчнай форме, якія не змяняюць сітуацыю ў фізічным сэнсе, а вядуць толькі да яе сімвалічнай перамены. Псіхалагічны аспект паломніцтва ўключае ў сябе вызначэнне матывацыі падарожжа, ацэнку ўбачанных сакральных аб'ектаў і з'яў, выяўленне эмацыянальных рэакцый на атрыманыя ўражанні. Такім чынам, паломніцтва можа разглядацца як тып «абрадаў пераходу» (згодна з вядомым французскім навукоўцам Арнольдам ван Геннепам [3]) – жыццёвага цыкла з рысамі ініцыяцыі. У структуры ўмоўных пераходаў чалавекам крытычных меж, абумоўленых радыкальнай зменай яго месцазнаходжання, стану, сацыяльнага статусу, навуковец вылучаў тры фазы: *аддаленне* (адмацаванне суб'екта ад месца, якое ён займае ў сацыяльным або касмічным кантынууме), *лімінальны перыяд* (стан кантактаў з «іншым» светам і сам пераход), *аднаўленне* (сімвал знаходжання новага стабільнага стану і закрыццё межаў у «іншы» свет).

Паліфанічныя рытуальныя практыкі паломніцтва разглядаюцца намі семіятычным метадам з пункту гледжання яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кодаў [1]. Да ліку сімвалічных моў сакральнага рытуалу адносяцца: *акцыянальны* (магічныя дзеянні, якія выконваюць удзельнікі); *агентыўна-персанажны* (адрасаты – аб’екты рытуалу і ўдзельнікі – яго суб’екты); *прасторавы* (сімвалічна адзначаныя локусы); *тэмпаральны* (звязаны з супрацьпастаўленнем «сакральнага» і «прафаннага» часу); *прадметна-атрыбутыўны* (аб’екты, прылады дзеянняў суб’екта рытуалу); *вербальны* (сакральныя слоўныя тэксты, імёны, тэрміны, якія вымаўляюцца ўдзельнікамі дзеяння на розных яго этапах); *музычны* (спевы, ігра на музычных інструментах); *выяўленчы* (рознага роду іканаграфічныя сімвалы, якія фіксуюць сакральны сэнс рытуалу). Функцыянуючы паралельна, гэтыя мовы забяспечваюць рытуалу трываласць і ўстойлівасць, спрыяючы яго найбольшай эфектыўнасці.

Сакральныя вандраванні пілігрымаў узніклі яшчэ ў архаічны перыяд, што было абумоўлена засваеннем новых зямель і вымушаным адрывам ад традыцыйных рытуальных локусаў (капішчаў, ахвярнікаў, свяцілішчаў), фарміраваннем уяўлення аб тым, што дасягненне сувязі з прадстаўнікамі язычніцкага пантэону багоў або светам духаў магчыма толькі праз выкананне пэўных абрадаў (якія атаясамляліся з нараджэннем, чароўнымі дзеяннямі і смерцю свяшчэннага аб’екта) у вызначаных месцах, за межамі звычайнага асяродку бытавання людзей (у гаях, ля крыніц). У змесце старажытнага паломніцкага рытуалу Абсалют суадносіўся з шэрагам ідэй, якія ўвасаблялі асновы традыцыйнага міфапаэтычнага менталітэту – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці стыхій, раслін, жывёл, камянёў, рэчаў, у іх цудатворны пачатак, наяўнасць паміж імі агульных сувязяў.

Асноўнымі фазамі акцыянальнага кода з’яўляюцца: рух да сакральнага аб’екта, у ходзе якога выконваюцца пэўныя магічныя дзеянні; кантакт са свяшчэнным аб’ектам, які ўключае ахвярапрынашэнне і просьбу паломніка; сыход з сакральнага месца і вяртанне суб’екта ў новай якасці ў зыходны (прафанны) стан.

Агентыўна-персанажны код. Да моманту прыняцця хрысціянства на шырокім прасторы, заселеным усходнімі славянамі, было мноства паганскіх свяцілішчаў і святых месцаў як агульнага рытуальнага прызначэння, так і прысвечаных асобным бажаствам. Захаванасць язычніцкіх тапонімаў сведчыць аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жывучасці іх першапачатковай функцыі і аб паступовым злучэнні архаічнага славянскага пачатку з хрысціянскім.

Падчас паломніцтваў часцей за ўсё ўшаноўваліся бяроза – сімвал жаночага бажаства, Берагіні, духа дабра і ўрадлівасці, даўгавечны дуб – дрэва Перуна. Дрэвы-ідалы, уключаныя ў рытуал, шчодра ўпрыгожваліся стужкамі і вышытымі ручнікамі, а тыя, што раслі каля крыніц, карысталіся асаблівым шанаваннем. Тут адначасова можна было звяртацца і да вегетатыўнай сілы культавых раслін, і да «жывой вады», якая біла з зямлі ключом.

Прасторавы код старажытнага паломніцкага рытуалу выяўляецца праз сімвалічнае асэнсаванне як святых месцаў, так і шляху да іх. Часцей за ўсё яны адзначаліся капішчамі і храмамі, дзе выконваліся маленні і ахвярапрынашэнні духам і бажаствам.

Абрадавыя падзеі нашых продкаў былі перыядамі не столькі радаснага, колькі складанага і вельмі адказнага характару. Святы адбываліся ў адмысловым часе – вечным, чароўным. Сакральным рытмам для земляробаў былі даты глыбокай пашаны і ўхвалення пэўных бажаствоў і продкаў, з якімі звязвалі ўрадлівасць зямлі і жыццёвую сілу членаў абшчыны. У культуры паляўнічых і жывёлагадоўцаў супольныя паломніцкія рытуалы звычайна прымяркоўваліся да пачатку і заканчэння паляўнічага перыяду.

Драматызацыя архаічнага рытуальнага паломніцкага дзейства прасочваецца ў яго вербальным, выяўленчым і музычным кодах – устойлівым выкарыстанні слоўна-паэтычных формул, сімвалаў, драматургічных прыёмаў, элементаў абарадавага касцюміравання і маскіравання, грыміроўкі знешняга аблічча, бутафорскіх знакаў, рэквізіту.

Пакланенне міфічным істотам, ідалам, а таксама асвячэнне прадметаў і месцаў, звязаных з культам, – агульнапрынятая з'ява для старажытных рэлігій – была ў рэшце рэшт засвоена хрысціянствам.

«У рэлігійнай практыцы пілігрымка – гэта карнавалізацыя наадварот, інверсія супрацьпастаўленняў мірское – святое і сакральнае – прафаннае. У індывідуальным сэнсе – асаблівае адлюстраванне рэальнасці, тое, што паломнік хоча бачыць у сваім штодзённым жыцці, нейкі ідэал, які яму не дасягнуць у жыцці абшчыны. Для даследчыкаў паломніцтва – гэта прамое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстраванне ў адным элеменце ўсяго жыцця канфесій» [7, с. 207].

Паломніцтва ў хрысціянстве ўспрымаецца як святы абавязак і звязаны з наведваннем Рыма, дзе, паводле падання, прынялі пакутніцкую смерць апосталы Пётр і Павел і дзе знаходзіцца папскі прастол, а таксама Святой зямлі, якая атаясамляецца ў вернікаў з зямным жыццём Ісуса Хрыста, Багародзіцы, пакутнікаў, цудатворцаў, апосталаў – аб'ектамі рытуалу. У народна-хрысціянскай традыцыі на сучасным этапе таксама існуюць агульназначныя і мясцовыя цэнтры глыбокага шанавання, што з'яўляецца вызначальным у прасторавым вектары паломніцтва. Шлях да святыні ў большасці прымяркоўваецца да ўрачыстых дзён царкоўнага календара. У шчырым сакральным вандраванні рэлігійная экстраардынарнасць месца лучыцца з кульмінацыйным момантам рэлігійнага часу – Уваскрэсеннем Хрыстовым.

Выпрацаваныя стагоддзямі рэгламентаваныя акцыі пілігрымаў уяўлялі сабой наступныя этапы «духоўнага пераходу»: споведзь у святара, працэс ачышчальнага перамяшчэння багамольцаў да сакральнага аб'екта; момант дотыку да свету Абсалюта – дакрананне да іконы, мошчаў, амавенне ў святой вадзе; дараванне індульгенцыі [8, с. 187–189], поўнае прабачэнне, абнаўленне, вяртанне грэшніка на шлях выратавання.

Пілігрымка вызначаецца не месцам і нават не мэтай, а станам душы і, як правіла, патрабуе той ці іншай ступені аскезы – посту на працягу ўсяго шляху да святыні, вялікіх пешых пераходаў (а часам і на каленях), выключэнне мірскіх забаў. Малітвы, рэлігійныя гімны, набажэнствы – асноўнае баўленне часу.

Прадметны код паломніцтва ў хрысціянскім веравызнанні праяўляецца ў трансфармацыі разумення прадмета, у змене яго семіятычнага статусу [2, с. 68], пры гэтым не ад нізкага да больш высокага, а да пашырэння варыятыўнасці гэтых сэнсаў. Сам паломнік і прадметы ўключаны ў адмысловы «наратыў цудоўнага» – адбываецца змена перажыванняў, дзеянняў і сэнсаў.

Ачышчальнае праваслаўнае вандраванне – гэта заўсёды малітоўны подзвіг, у структуру якога ўключаюцца набажэнства (звычайна літургія), чытанне акафістаў (праслаўленне), малебны, якія з'яўляюцца складнікамі вербальнага кода.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з самых важных і ўрачыстых падзей рэлігійнага жыцця беларускіх каталікоў з'яўляецца пілігрымка ў Будслаўскі касцёл, дзе ў ліпені 1998 г. прайшла цырымонія каранавання цудатворнай іконы Божай Маці. Напярэдадні вандравання ў архікафедральным саборы Прасвятой Дзевы Марыі ўдзельнікі пілігрымкі атрымліваюць спецыяльнае благаслаўленне мітрапаліта, крыж – сімвал веры і надзеі, а кіраўнік малітоўнага шэсця – адмысловыя сімвалы: карту, барометр і свісток.

У дзень прыбыцця да базілікі паломнікі ажыццяўляюць сімвалічны хрэсны ход у памяць аб пакутах Хрыста падчас узыходжання на Галгофу. Некалькі кіламетраў яны нясуць у руках камяні – сімвал уласных грахоў, з якіх потым утвараецца ўмоўны алтар – біблейны знак прымірэння чалавека з Абсалютам, вызвалення ад парушэння Божай волі.

Падчас урачыстасці ў самым цэнтры ўвагі знаходзіцца адзін з найбольш шанаваных каталіцкіх абразоў на Беларусі – Маці Божай Будслаўскай. Каб паказаць высокую ступень павагі да цудатворнага касцёльнага вобраза, некалькі метраў перад ім вернікі рухаюцца на каленях. Відовішчнай кульмінацыяй комплексу святочнага дзейства з'яўляюцца святочныя працэсія ў поўнач з копіяй іконы, якая пераліваецца мноствам агеньчыкаў, нібы вогненная рака, і начная імша.

Рэнесанс праваслаўнай традыцыі пілігрымак у Беларусі адбываецца напачатку 90-х гг. XX ст. Штогадовыя пешыя вандраванні ў Жыровічы прыпадаюць на Прачысценскі пост з 14 па 27 жніўня. У свядомасці вернікаў Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр з'яўляецца сакральным цэнтрам паломніцтва, у якім кожны знаходзіць суцяшэнне ў смутку, умацаванне ў веры, пакорлівасці, духоўных сілах, атрымлівае благаслаўленне.

Яшчэ адной формай даследуемага аб'екта з'яўляецца свецкае паломніцтва, якое набыло распаўсюджанасць у другой палове XX – пачатку XXI ст. у структуры гарадской святочнай культуры. «Каб знайсці дакладную мяжу паміж двума відамі падарожжаў – свецкім і рэлігійным, – неабходна прызнаць, што яны адрозніваюцца не па мэтах, не па спосабе наведвання святых месцаў, а па іх звышзадачах» [6, с. 154]. Калі ў хрысціянскім веравызнанні падарожжы вернікаў садзейнічаюць захаванню ў народным асяроддзі, трансмісіі з пакалення ў пакаленне рэлігійных традыцый і звычаяў, то ідэйнай асновай

свецкіх паломніцтваў з’яўляецца пакланенне грамадска-культурным і афіцыйна-палітычным святыням. У гэтым выпадку сакралізуецца не сам аб’ект пакланення (помнік, магіла, будынак), і нават не асоба, а этычныя, культурныя, духоўныя каштоўнасці канкрэтнай сацыяльнай групы (творчая незалежнасць, свабода, непаўторнасць, ісціна і нават рэлігійнасць).

Вывучэнне існавання, жыццядзейнасці, вызначэнне месца рытуалу паломніцтва ў сістэме традыцыйнай культуры робіць заўважнымі яго асноўныя функцыі. Функцыя *падтрымання касмічнага і сацыяльнага парадку*; *рэгулятыўная* функцыя (устанаўленне адрозненняў паміж рэчамі, калі ўзнікае пагроза іх сумяшчэння); функцыя *інтэграцыі* (уздзеянне на эмацыянальны стан, умацаванне ўзаемасувязі вернікаў паміж сабой, з продкамі і нашчадкамі, мінулым і будучым); *духоўна-асветная, місіянерская і адукацыйная* функцыі; функцыя *сацыялізацыі індывіда*; *рэпрадуктыўная* функцыя (падтрымка існуючай сістэмы каштоўнасцей, здольнасць узнаўлення або актуалізацыі традыцыі); *медыятыўная* (размежаванне сакральнага і прафаннага, чалавечага і звышнатуральнага); *гаючая і ахоўная* функцыі; *псіхатэрапеўтычны эфект* (механізмам стварэння псіхалагічнага камфорту), функцыя *атрымання прароцтва*.

Такім чынам, на сучасным этапе паломніцтва застаецца адной з культурных з’яў, якая найбольш актыўна развіваецца і дзе аб’ядноўваюцца глыбокія гістарычныя традыцыі з культурнымі тэндэнцыямі сённяшняга дня. Поліфункцыянальнасць рытуалу паломніцтва сведчыць аб яго ўнікальнай ролі ў гісторыі грамадства як традыцыйна выпрацаванага метаду сацыяльнага выхавання індывідаў, далучэння іх да абрадавых практык і сакральных нормаў калектыўнага жыцця.

---

1. *Байбурин, А. К.* Коды обряда и их взаимодействие / А. К. Байбурин // Фольклор: проблемы сохранения, изучения и пропаганды: Всесоюз. науч.-практ. конф., 25–28 апр.1988 г. : тезисы: в 2 ч. – М. : ГМПИ, 1988. – Ч. 1. – С. 139–145.

2. *Байбурин, А. К.* Семиотические аспекты функционирования вещей / А. К. Байбурин // Этнографическое изучение знаковых средств культуры. – Л. : Наука, 1989. – С. 63–88.

3. *Геннеп, А.* Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с фр. Ю. В. Ивановой, А. В. Покровской. – М. : Восточная литература, 1999. – 198 с.

4. Духовно-нравственное воспитание на основе отечественных культурно-исторических и религиозных традиций и ценностей: материалы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Междунар. науч.-практ. конф., Жировичи, 27 мая 2010 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии ; Белорус. Экзархат Моск. Патриархата Рус. Правосл. Церкви. – Минск : Белорус. наука, 2010. – 389 с.

5. *Калужникова, Е. А.* Паломничество как ритуал. Сущность и культурно-исторические типы : автореф. дис. … канд. культурологии: 24.00.01 / Е. А. Калужникова ; Урал. гос. ун-т им. А. М. Горького. – Екатеринбург, 2007. – 23 с.

6. *Силантьева, М. В.* Духовный смысл православного паломничества в эпоху глобализации / М. В. Силантьева // Паломничество и религиозный туризм: многообразие интерпретаций : сб. науч. ст. / отв. ред. и сост. И. Е. Викулов ; Владим. гос. ун-т им. А. Г. и Н. Г. Столетовых. – Владимир : Изд-во ВлГУ, 2011. – С. 150–173.

7. *Фолиева, Т. А.* Паломничество как отражение повседневности / Т. А. Фолиева // Там же. – С. 198–208.

8. *Щеглов, А. Д.* Индульгенция / А. Д. Щеглов // Словарь средневековой культуры / под ред. А. Я. Гуревича. – М. : РОССПЭН, 2003. – С. 187–189.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Алиция Сковронэк (Alicja Skowronek)***,
*магистр этнологии, докторант*
*кафедры этнологии и культурной антропологии,*
*Щецинский университет (Польша)*

## ВЫШИВКА КАК ЭЛЕМЕНТ КУЛЬТУРЫ ЗАПАДНОГО ПОМОРЬЯ

Поморье – этот географический регион в полной мере ощутил вихри истории (территориальные разделы, завершившиеся только после окончания Второй мировой войны). Поэтому примерно лишь 70 лет воссоздается на этих землях местная идентичность. Население, переселившееся из разных частей Польши, узнает свою общую историю, ищет символы идентификации с регионом, в котором оно стало жить. Младшие поколения хотят узнать историю и традиции своих дедов, хотят знать, из каких культурных кругов они родом. Поэтому все сильнее становятся движения, цель которых сохранение, воссоздание, а также создание современной культуры Поморья.

Лучше всего эти процессы проявляются в искусстве, в создающихся народных коллективах, возрождающихся народных танцах, песнях, традициях. Одним из носителей памяти о прошлом является вышивка как вид искусства: каждое село, каждый регион выделялся собственным искусством «рисова-